Наименование ТВП: Тикины острова

© С. Левый

Код: BY041

Географические координаты: 55° 38' N 27° 29' E

Административная принадлежность: Витебская область: Миорский район

Площадь: 6364 га

Критерии: B2

Национальный природоохранный статус: Рэспубліканскі гідралагічны заказнік «Балота Мох»

Международный природоохранный статус: ТВП рэгіянальнай значнасці

Общее описание:

ТВП уяўляе сабой буйное верхавое балота з мінеральнымі астравамі, азёрамі, рэкамі і мачажынамі, акружанае па краях хвойнымі і лісцёвымі лясамі. Па ўсім балоце раскіданы шматлікія мінеральныя грывы, якія атрымалі назву Цікіны астравы. Унікальнасць гэтым парослым лесам астравам прыдаюць групы старых дубоў, ясеняў і клёнаў.

З захаду да балота прымыкае буйное мезатрофнае возера Нобіста (3,75 км^2).Возера мелкаводнае, у летні час практычна цалкам зарастае воднай расліннасцю.

Берагі месцамі ўтвараюць буйныя сплавіны, парослыя балотнымі відамі асокаў. Для рэгуляцыі ўзроўню вады ў возеры на рацэ Хараброўка, якая выцякае з яго, пабудавана водарэгулюючая плаціна. У выніку рэчышча Хараброўкі ніжэй возера зарасло воднай расліннасцю і месцамі перакрылася сплавінамі, плынь практычна адсутнічае. На гэтым участку ў Хараброўку ўпадаюць шматлікія лесамеліярацыйныя каналы і рака Голчыца, якая перасякае ўвесь балотны масіў з поўдня на поўнач.

З-за высокай забалочанасці тэрыторыі і адсутнасці дарожнай сеткі лесагаспадарчая дзейнасць тут вядзецца толькі па перыферыйных участках, практычна цалкам адсутнічаюць сельскагаспадарчыя ўгоддзі. Асноўнымі формамі гаспадарчай дзейнасці з’яўляюцца паляванне і рыбалоўства. Арандатарамі возера Нобіста праводзіцца зарыбленне вадаёма, рэгуляцыя ўзроўню вады. Жыхары навакольных населеных пунктаў збіраюць на балотах журавіны і брусніцы, у лясах – чарніцы і грыбы.

Флора налічвае 223 віда сасудзістых раслін. Асаблівую каштоўнасць для захавання рэдкіх відаў раслін уяўляюць градава-мачажынныя і мачажынна-азёрныя балотныя комплексы. Шматлікія адкрытыямачажыны параслі расіцай круглалістай *Droserarotundifolia*, асакой багнавай *Carexlimosa*, чаротнікам белым *Rhynchosporaalba*, багноўкай чорнай *Empetrumnigrum* і іншымі тыповымі балотнымі барэальнымі відамі. У наваколлі возера Чорнае адзначана адна з буйнейшых пладаносных папуляцый марошкі *Rubuschamaemorus* (пладанашэнне гэтага віду – вельмі рэкая з’ява ва ўмовах Беларусі), якая занесена у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Основные биотопы:

Верхавыя балоты – 70%, лясы – 20%, азёры – 10%.

Птицы:

Усяго на тэрыторыі ТВП адзначана 202 віды птушак, 188 з іх гняздуюцца. Тут з дастаткова высокай шчыльнасцю гняздуюцца такія рэдкія віды птушак як чорны бусел *Ciconianigra*, скапа *Pandionhaliaetus* і балотная сава *Asioflammeus*.

Другие группы животных:

У фауне ТВП прадстаўлены ўвесь набор млекакормячых, характэрных для

поўначы Беларусі. Тут звычайныя лось *Alcesalces*, дзік *Susscrofa*, казуля *Capreolus capreolus*. У сухіх лясах па краях балот сустракаецца заяц-русак *Lepuseuropaeus*, а ў багуновых сасняках і на пераходных балотах - заяц-бяляк *Lepustimidus*. З драпежнікаў ва ўгоддзі жывуць воўк *Canislupus*, лісіца звычайная *Vulpesvulpes*, куніца лясная *Martesmartes*, норка амерыканская *Mustelavison*, ласка *Mustelanivalis* , гарнастай *Mustelaerminea*. У рэках і азёрах ТВП шматлікі бабёр рачны *Castorfiber*, сустракаецца выдра *Lutralutra*. Возера Нобіста багатае на рыбныя запасы, жыве тут і каштоўны прамысловы від – вугор рачны *Anguillaanguilla.*

Состояние редких видов птиц:

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды	Критерий ТВП
Черный аист *Ciconia nigra*	гн	10 п	2000-2005	Т		В2
Змееяд *Circaetus gallicus*	гн	1-3 п	2000-2005	Э		
Скопа *Pandion haliaetus*	гн	5 п	2000-2005	Т		
Журавль серый *Grus grus*	гн	+	2000-2005	П		
Чайка сизая *Larus canus*	гн	+	2009	П		
Сова болотная *Asio flammeus*	гн	10-15 п	2000-2005	П		

Другие редкие и находящиеся под угрозой исчезновения виды:

Насякомыя: аксамітніца юта *Oeneisjutta,* тарфянікавая жаўтушка*Coliaspalaeno.*

Расліны: баранец звычайны *Huperziaselago*, асака малакветкавая *Carex pauciflora*, цыбуля мядзведжая *Alliumursinum*.

Угрозы:

Адносна слабая населенасць тэрыторыі вызначае невысокі ўзровень антрапагенных нагрузак на прыродныя супольніцтвы ТВП. Асноўнымі неспрыяльнымі фактарамі тут з’яўляюцца парушэнне гідралагічнага рэжыму, высечкі лесу і пажары.

Парушэнне гідралагічнага рэжыму ўгоддзя звязана з пракладаннем асушальных каналаў, спрамленнем рэчышча ракі Хараброўка і зарэгуляваннем узроўню Абстэрнянскай групы азёраў. Леса-меліярацыйная сетка прыводзіць да перасыхання перыферыйнай часткі балота ў летні час і зніжэння разнастайнасці водна-балотных відаў жывёл і раслін.

Лясныя пажары, якія перыядычна ўзнікаюць ва ўгоддзі, з’яўляюцца адной з асноўных пагроз прыродным комплексам ТВП.

Высечкі лесу з-за высокай забалочанасці тэрыторыі носяць абмежаваны характар. Тым не менш, захоўваецца пагроза высечкі старых лясоў па ўскраінах балот і сухіх градах, якія з’яўляюцца месцамі жыхарства рэдкіх відаў жывёл і птушак.

Рекомендации по сохранению:

Для захавання натуральных біяцэнозаў ТВП неабходна: пераўтварыць рэспубліканскі гідралагічны заказнік у ландшафтны; пры карэктыроўцы межаў заказніка ўключыць у яго ўсю ТВП; распрацаваць шматгадовы план кіравання заказнікам; правесці паўторнае забалочванне меліярацыйных сістэм і торфараспрацовак “Хараброва” і “Буянава”.

Источники информации:

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Іваноўскі У.В., Максіменкаў М.В., Скуратовіч А.М., Навіцкі Р.В.)

Сушко Г.Г., Шкатуло В.В., Борок И.И. Редкие и охраняемые виды насекомых

обитателей верховых болот Белорусского Поозерья // Красная книга Республики Беларусь: состояние, проблемы, преспективы: материалы международной научной конференции. – Витебск: УО “ВГУ им. П.М. Машерова”, 2011., с. 171-173.

Составители : Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*